Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 07/07/2026 11:51:15

DOI:10.17951/sb.2025.19.9-27
Studia Białorutenistyczne 19/2025 HISTORY, CULTURE AND SOCIOLOGY
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Raisa Zianiuk

Independent researcher (Belarus)
e-mail: zianiukraja@gmail.com
https://orcid.org/0000-0002-4743-3538

# "Употребление пива кажется для них необходимостью". Роля алкаголю ў жыцці каталіцкіх манаскіх супольнасцей на беларуска-літоўскіх землях у канцы XVIII–XIX стст.

*"Drinking Beer Seems to Be a Necessity for Them": the Role of Alcohol in the Life of Catholic Monastic Communities in the Belarusian-Lithuanian Lands at the End of the 18th–19th Centuries*

*„Picie piwa wydaje się im koniecznością". Rola alkoholu w życiu katolickich wspólnot zakonnych na ziemiach białorusko-litewskich w końcu XVIII–XIX wieku*

**Abstract**

The purpose of the article is to highlight the main role of alcoholic beverages in the life of Catholic monastic communities on the territory of Belarusian and Lithuanian lands at the end of the 18th–19th centuries. The source base of the article consists of written documentary materials from archives of different countries (Lithuania, Belarus, Poland, Russia). The article includes all types of alcohol: both light (beer, honey, wine) and strong (vodka, rum, arak). The author singles out traditional, consolidating, disintegrating, festive, food, economic, status and aggravating roles and illustrates each of them with specific examples.

**Keywords**: monasteries, monastic life, alcohol, 19th century, alcoholism

**Abstrakt**

Celem artykułu jest prezentacja roli napojów alkoholowych w życiu katolickich wspólnot zakonnych na terenie ziem białoruskich i litewskich w końcu XVIII–XIX wieku. Podstawę źródłową artykułu stanowią pisemne dokumenty z archiwów różnych krajów (Litwa, Białoruś, Polska, Rosja). W artykule uwzględniono wszystkie rodzaje alkoholu: zarówno lekkiego (piwo, miód, wino), jak i mocnego (wódka, rum, arak). W pracy przedstawiono różne role: tradycyjną, konsolidującą, dezintegrującą, rekreacyjną, żywnościową, ekonomiczną, statusową i obciążającą. Każdą z nich zilustrowano konkretnymi przykładami.

**Słowa kluczowe**: klasztory, życie zakonne, alkohol, XIX w., alkoholizm

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 07/07/2026 11:51:15



**Abstrakt**

Мэтай артыкула з’яўляецца вызначэнне галоўных роляў алкагольных напояў у жыцці каталіцкіх манаскіх супольнасцей на беларуска-літоўскіх землях у канцы XVIII–XIX стст. Крыніцавую базу артыкула складаюць дакументальныя матэрыялы з архіваў розных краін (Беларусь, Літва, Польшча, Расія). У артыкуле ўлічваюцца ўсе віды алкаголю, як лёгкі (піва, мёд, віно), так і моцны (гарэлка, ром, арак). Вылучаюцца наступныя ролі алкаголю: традыцыйная, кансалідуючая, дэзінтэгруючая, рэкрэацыйная, статусная, гаспадарчая, абцяжарваючая. Кожная з іх раскрываецца на канкрэтных прыкладах.

**Ключавыя словы**: кляштары, манаскае жыццё, алкаголь, XIX ст., алкагалізм

Традыцыйна, розныя віды алкаголю былі ўкаранёныя ў жыццё не толькі свецкіх слаёў грамадства (вывучэнне культуры спажывання алкаголю даследавала Дыас-Левандоўска (Dias-Lewandowska, 2017), але і духавенства, у тым ліку каталіцкіх манаскіх супольнасцей. Найперш гэта было віно, якое выкарыстоўвалася падчас літургіі. Аднак, важнае значэнне алкаголь меў у пазалітургічнай практыцы рымска-каталіцкай царквы. Шэрагу аспектаў, прысвечаных традыцыям спажывання і вырабу алкаголю ў рымска-каталіцкіх манастырах ужо быў прысвечаны асобны артыкул (Zianiuk, 2022). Важным, аднак, з’яўляецца даследаванне таго, якім чынам алкаголь уплываў на жыццё манаскіх супольнасцей. У сувязі з гэтым, мэтай артыкула з’яўляецца вылучэнне асноўных ролей алкагольных напояў у жыцці каталіцкіх манаскіх супольнасцей на тэрыторыі беларускіх і літоўскіх земляў у канцы XVIII–XIX стст.

Традыцыі харчавання, да якіх залічваецца і ўжыванне алкаголю, вынікалі ў аднолькавай ступені з рэгіянальных і саслоўных традыцый, як з кляштарных і манаскіх. Адпаведна, у кляштарах спажываліся тыя ж віды алкаголю, якія былі характэрны для беларуска-літоўскіх зямель агулам, а таксама для шляхты і мяшчанаў (якія складалі пераважную большасць духавенства).

Бясспрэчным лідарам па аб’ёмах спажывання да 60-ых гг. XIX ст. было піва. У дакументах адзначаюцца яго розныя віды і характарыстыкі: (лёгкае (lekkie), добрае (dobre), горшае (podlejsze), дубальтовае (dubeltowe), нямецкае (niemieckie), піва для падагрэву (piwo do grzania), сакавіцкае (marcowe), портэр (porter). Колькасць яго спажывання традыцыйна павялічвалася ў пасты, што было звязана з каларыйнасцю напою, неабходнай на фоне больш сціплага харчавання ў азначаны перыяд. Таксама лічылася, што напоі (у тым ліку алкагольныя) не парушаюць правілаў посту.

Адным з найбольш традыцыйных напояў быў мёд. Тут у якасці прыкладу можна прывесці дадзеныя за 1841 г. з кнігі прыходу і расходу (грошай) ковенскага кляштара сясцёр бенедзікцінак (LMAVB, 318/215). У студзені яны выдалі за 2 гарнцы пітнога мёду 1 р. 20 к., у лютым за 2 гарнцы – 1 р. 20 к., у сакавіку за 3 гарнцы – 1 р. 80 к., у лістападзе за 1 гарнец – 90 к., у снежні за

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 07/07/2026 11:51:15



2 гарнцы – 1 р. 20 к. Калі казаць пра від пітнага мёду, хутчэй за ўсё гэта быў тзв. двайняк (dwójniak), паколькі трайняк (trójniak) звычайна пазначалі асобна, як гэта рабілі, напрыклад, віленскія францысканцы (LVIA, 694/1/144). Месяцы, у якія абдываліся выдаткі на мёд у ковенскіх бенедзікцінак, могуць сведчыць аб тым, што яны мелі свой дадатковы спосаб на перажыванне постаў і халоднай пары года – гэта не толькі павелічэнне спажывання піва, але і павелічэнне спажывання пітнага мёду.

Наступным відам алкаголю, які спажываўся ў кляштарах, было віно (у дакументах даюцца яго розныя характарыстыкі, напрыклад, "старое" (stare), "лепшае" (lepsze), "звычайнае" (ordynarijne). Гэты напой набываўся як для літургічных мэтаў, так і для звычайнага спажывання. Традыцыйна спажывался таксама і гарэлка. У дакументах занатаваны розныя яе назвы і віды: wódka, gorzałka; wódka alembikowa, wódka słodka, wódka zwykła.

Досыць папулярным алкагольнымі напоямі былі арак і ром. Стандартным наборам алкагольных напояў, якія спажываліся ў кляштарах (як манахамі, так і служачымі), і якія захоўваліся ў кляштарных склепах былі піва, мёд, гарэлка і віно.

Алкаголь для спажывання альбо вырабляўся ў кляштарных броварах, альбо набываўся. Набывалі алкаголь у выпадку, калі кляштар не меў уласнага бровару, калі яго прадукцыя была недастатковай, альбо для пашырэння звычайнага асартыменту, наяўнага ў кляштары. Напрыклад, сярод напояў, якія рэгулярна набывалі віленскія францысканцы ў 1810 г. было: піва (розных відаў: піва добрае (piwo dobre), піва лёгкае (piwo lekkie); віно (у рахунках пазначалася: віно лепшае (wino lepsze), віно старое (wino stare); гарэлка (адзначалі: салодкую гарэлку (wódkę słodką) алембіковую гарэлку (wódkę alembikową); а таксама мёд (miód) (LVIA, 694/1/144).

Алкаголь у жыцці каталіцкіх манаскіх супольнасцей адыгрываў шэраг ролей, сярод якіх можна вызначыць некалькі асноўных.

**1. Традыцыйная роля, альбо алкаголь як элемент традыцыі**. У гэтай катэгорыі гаворка перадусім вядзецца пра піва (Unger, 2023). Спажыванне і выраб піва былі такімі ж элементамі манаскіх, кляштарных і ордэнскіх традыцый як і хабіт, фурта, кляўзура і інш. Пра значэнне піваварэння ў рымска-каталіцкай царкве агулам сведчыць і тое, што касцёл вызначыў шэраг святых-апекуноў піваварэння, піваравараў і броварства: св. Патрык, св. Арнульф з Меца, інакш – св. Арнульф Піваварскі, св. Аўгустын, св. Лука-евангеліст, св. Вацлаў і інш.

Значнасць алкаголю ў жыцці манастыроў можна назіраць і па тым, як акуратна яго спажыванне занатоўвалася эканомамі альбо настаяцелямі манастыроў. Тут цікавым прыкладам з'яўляюцца маргіналіі, змешчаныя ў рубрыцэлі для кармелітаў Літоўскай правінцыі на 1791 г., што захоўваецца ў бібліятэцы Чартарыйскіх у Кракаве (BCZ, K2561). Літоўская правінцыя ахоплівала беларуска-літоўскія землі, і па ўскосных звестках межна меркаваць,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 07/07/2026 11:51:15



што гэтая рубрыцэль належыла гарадзенскаму кляштару. Важна разумець, што такія календары – рубрыцэлі – увогуле прызначаны выключна для літургічных мэтаў. У згаданым асобніку можна бачыць дастаткова колькасныя маргіналіі, большасць якіх прысвечана акурат спажыванню алкаголю. Напрыклад, насупраць даты 1 студзеня пазначана: “[пачалі] маладое піва”, насупраць 8 студзеня – “пачалі алембіковы спірытус”, насупраць 21 студзеня – “маладое піва [пачалі] у рэфектарыі”, 22 лютага – “[пачалі] піва”, 24 лютага – “пачалі алембіковую гарэлку”, 17 сакавіка – “звозілі піва”, 26 сакавіка – “пачалі [...] у рэфектарыі піва” (BCZ, K2561) і г.д.

Задавальненне патрэб у асноўных відах алкаголю традыцыйна забяспечвалі ўласныя бровары, якія знаходзіліся альбо непасрэдна пры кляштары, альбо ў кляштарных фальварках, альбо – часцей за ўсё – і там, і там (Zianiuk, 2022, s. 54–74). Напрыклад, астроўненскія дамініканцы ў 1818 г. мелі толькі адзін бровар у фальварку. У дакуменце адзначана: “Бровар у фальварку Гарадня малы, на хатнія патрэбы дастатковы (NGAB, 1781/26/1396, k. 37)”.

Цыстэркі ў Кімбараўцы (Мазыр) у 1818 г. пры кляштары мелі бровар, у якім варылі піва. Знаходзілася там: баня для варкі піва 1, канеўкі 3, чарпакоў 2, піўных бочак 12, заторная кадка 1. У фальварку ж бровар быў прызначаны перадусім для прадукцыі гарэлкі, а ў другую чаргу – піва, там знаходзіліся: заторных катлоў – 2, баня для гарэлкі (bania wódczana) – 1, шапка – 1, трубак – 8, бочка для адводу – 1, заторных кадак – 3 (NGAB, 1781/27/370).

У Гарадзішчы пры кляштары бенедзікцінак у 1829 г. бровар быў мураваны, крыты дахоўкай, з выведзеным на дах комінам, у якім была вылучана асобная ізба для пражывання піўвара. Да бровара прымыкаў склад для захоўвання броварных начынняў, а перад піваварняй знаходзілася студня (NGAB, 1781/27/430).

Як вынікае з дакументаў, на беларускіх землях найчасцей алкаголь набывалі, а не варылі ва ўласных броварах, якіх часта не мелі, у кляштарах трынітарыяў. Выраб віна, у адрозненне ад кляштараў Заходняй Еўропы (гл. напр. Sporek, 2013) на беларуска-літоўскіх землях не аднатаваны ў сувязі з адсутнасцю неабходнай сыравіны. За захаванне традыцыі прадукцыі і спажывання піва манахі змагаліся да канца XIX ст.

**2. Кансалідуючая роля**. Гэта функцыя вынікала з папярэдняй, традыцыйнай. Мала якія рэчы выклікалі большае аднадушша прадстаўнікоў манаскіх супольнасцей. Напрыклад, пры ўвядзенні новых падаткаў на выраб/увоз алкаголю ў пэўную мясцовасць і абмежаваннях манаскіх супольнасцяў у яго спажыванні або вырабе, усё каталіцкае манаства горада альбо кляштара аб’ядноўваліся і змагаліся супраць такіх новаўвядзенняў. Гэта, аднак, было цесна звязана з разуменнем ужывання і вырабу алкаголю (перадусім піва) як элемента традыцыі, за захаванне якой дбалі на ўсе магчымыя спосабы.

У якасці першага прыклада прывядзем сітуацыю, якая склалася ў Гродне ў 1819 г. Мясцовыя аткупшчыкі забаранілі гарадзенскім кляштарам варыць піва без

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 07/07/2026 11:51:15



уплаты падатку паводле новай пастановы Сената 1818 г. Прадстаўнікі гарадзенскіх манаскіх супольнасцей палічылі гэта "несправядлівым да манастыроў нашых за выраблянае для ўласнай сваёй патрэбы піва (CNB, 23/1/219)".

У сувязі з гэтым настаяцелі абсалютна ўсіх гарадзенскіх кляштараў: дамініканскага – Пляцыд Кошка, кармеліцкага – Уладзіслаў Качановіч, францысканскага – Казімір Бараноўскі, бернардзінскага – Франц Чарнеўскі, брыгідак – Барбара Храптавічуўна, бернардзінак – Ізабэла Струмінская ў сакавіку 1819 г. скіравалі адмысловую "прэтэнзію" не толькі адносна дзеянняў адкупшчыкоў і гарадской паліцыі, але і на новае заканадаўчае абгрунтаванне гэтых дзеянняў, якое базавалася на пастанове Сената ад 24 II 1819, і першая частка якога абавязвала прымушаць манастыры да ўнёску грошай, якія накіроўваюцца ў піцейны даход. У прэтэнзіі настаяцеляў прыняцце гэтай пастановы акрэслівалася словамі "зусім неразумна". Настойлівай просьбай усіх манаскіх супольнасцей г. Гродна было, каб указам Імператара "загадана было гэтае нашае прашэнне ў Літоўска-Гродзенскім Губернскім праўленні прыняць і [...] аб звальненні тутэйшых манастыроў ад выплаты за выраблянае піва пошлін (CNB, 23/1/219, k. 2)".

У якасці другога прыкладу можна прывесці гісторыю, якая адбылася ў кляштары бернардзінцаў у Крэтынзе (Ковенская губерня, Цельшаўская дыяцэзія; кейс упершыню апублікаваны ў: Zianiuk, 2022, s. 70–71). Пасля ўвядзення акцызу ў 1863 г. расійскімі ўладамі праводзілася кампанія па выяўленні месцаў і выпадкаў безакцызнага вінакурэння. Амаль адначасова, падчас паўстання 1863–1864 гг., пільная ўвага расійскіх уладаў была звернута на каталіцкія кляштары, паколькі менавіта яны лічыліся недобранадзейнымі ў палітычным сэнсе. У выніку, было высветлена, што на кляштарным падворку бернардзінцаў у Крэтынзе знаходзіўся каменны будынак бровара, які кіраўнік акцызнымі зборамі з панятымі падчас аблавы знайшоў у працэсе працы: у печы пад піваварным катлом быў разведзены агонь, а ў самім катле варылася піўное сусла, у заторным чане знаходзіўся солад, а яшчэ ў адной ёмістасці знаходзілася злітае піўное сусла для ахалоджвання хмелем. Камісія ўстанавіла, што варка піва пачыналася ў 8 гадзін вечара, а заканчывалася ў 12 гадзін наступнага дня (RGIA, 574/2/808, k. 8–16). У прадстаўленым рапарце адзначалася, што: "Бернардзінскі кляштар сапраўды без ведама Акцызнага Упраўлення ажыццяўляў піваварства на асабліва (і па асабістым маім аглядзе) добра ўладкаваным заводзе; не кажучы ўжо пра тое, што становішча ў гэты час краю цалкам тлумачыць такое парушэнне Статута аб піц[ейным]. зборы. Няправільнае піваварэнне ў Бернардзінскім манастыры было знойдзена ў самы разгар былога мецяжу ў Ковенскай губерні, а які ўдзел прынялі ў ім каталіцкія манастыры і каталіцкае духавенства, вядома ўсім, і таму ў такі смутны час, манахі Бернардзінскага кляштара маглі палічыць сабе ўсё дазволеным, і па меншай меры дазволіць сабе безакцызнае піваварства (RGIA, 574/2/808, k. 3v.–4)".

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 07/07/2026 11:51:15



Камісія вырашыла, што бернардзінцы варылі піва не для ўласных патрэб, але для продажу і для паставак паўстанцам. Кіраўнік акцызнымі зборамі па Ковенскай губерні прапаноўваў пакараць бернардзінцаў у адпаведнасці з параграфамі 369 і 370 Статута аб піцейным зборы. Выкарыстоўваючы гэтыя параграфы, Кіраўнік акцызнымі зборамі па Ковенскай губерні прапановаў спагнаць з бернардзінцаў за перыяд з 1 I 1863 па 6 VIII 1863 г. суму ў 15 936 р. 48 к. (RGIA, 574/2/808, k. 5v–8). Акрамя гэтага, ён прапаноўваў канфіскаваць запасы і зваранае піва (RGIA, 574/2/808, k. 5v.–7)".

Аднак, манахі гэтага манастыра адмаўляліся ад вызначанага штрафу, і больш таго, нават у той складанай сітуацыі настойліва спрабавалі захаваць за сабой права піваварэння для ўласных патрэб. Яны звярнуліся да мясцовага біскупа, той, у сваю чаргу, да губернатара і ў Міністэрства фінансаў, з просьбай улічыць што: "манахі, усе амаль старэчых ужо гадоў, раптам пазбаўленыя ўжывання піва, знайшліся ў даволі цяжкім становішчы і праз свайго Настаяцеля прасілі мяне аб выпрошванні для іх ва Урада пакінуць у непарушнасці дадзены ім раз прывілей; прыхіляючыся да іх справядлівага жадання, пераважна ж маючы на ўвазе, што пры пастаянных пастах, якія па статуту свайго ордэна яны строга выконваць абавязаны, ужыванне піва здаецца для іх неабходнасцю". Гэтым зваротам біскуп прасіў задаволіць просьбу манахаў і надалей працягваць варыць піва пры крэцінгскім кляштары. У выніку, справа, якая цягнулася пяць год была скончана 10 IV 1869 г. У лісце з Міністэрства фінансаў адзначалася, што прымаючы да ўвагі тое, што ў дадзеным выпадку піва, адпаведна арт. 233 Статута аб піцейным зборы выдання 1867 г. варылася выключна для хатняга ўжывання, а піваварня была ўладкавана яшчэ да ўвядзення ў 1863 г. акцызнай сістэмы, Міністэрства фінансаў лічыла правільным зацвердзіць рашэнне Ковенскай крымінальнай палаты (RGIA, 574/2/808, k.17–17v.) дазволіць варыць піва і скасаваць штраф.

Алкаголь, аднак, адыгрываў не толькі інтэгруючую функцыю ў жыцці манаскіх супольнасцей. Вельмі часта ён станавіўся прычынай дэзыінтэграцыі жыцця супольнасці, а таксама аказваў негатыўную ролю ў фарміраванні вобраза манаства ў грамадстве.

**3. Дэзынтэгруючая роля**. Дастаткова свабодны і пастаянны доступ да алкаголю не абыходзіўся без выпадкаў алкагалізму сярод асобных манахаў. Гэта ўплывала на агульнае пагаршэнне жыцця ў супольнасці кляштара. Часам алкагалізм прыводзіў да самагубстваў альбо спроб самагубства сярод манахаў. Таксама алкагалізм членаў манаскіх супольнасцей уплываў на фарміраванне негатыўнага вобраза манаства, манаскай супольнасці ў той мясцовасці, дзе яны дзейнічалі, у выпадку калі гэта станавілася вядомым па-за сценамі кляштара (эвалюцыя стаўлення да алкагалізму адлюстравана ў: Dias-Lewandowska, 2019). Гэты тэзіс можа быць праілюстраваны шэрагам прыкладаў.

У 1833 г. у Слоніме адбываліся падзеі, якія закранулі не толькі супольнасць кляштара, але і насельніцтва горада (упершыню апублікавана ў: Zianiuk, 2022,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 07/07/2026 11:51:15



s. 70–71). Пра незвычайнае здарэнне ў кляштары рэгулярных латэранскіх канонікаў слонімскі гараднічы дакладваў Гродзенскаму грамадзянскаму губернатару Мураўёву ў рапарце ад 30 VI 1833 г. (NGAB Grodna, 1/27/426) Гараднічы пісаў, што з моманту ўступлення на пасаду ў 1832 г. ён часта чуў аб непрыстойных паводзінах ксяндзоў з кляштара рэгулярных канонікаў. Пазней, па словах гараднічага, ён пераканаўся ў праўдзівасці гэтых чутак, паколькі "у гэтым манастыры большасць маладых людзей займаюцца распустай, іншыя ж п'янствам, так што іх бачаць нецвярозымі ў карчмах, білярдах і шынках, да таго маючы навучаць моладзь гэта можа быць самым шкодным прыкладам. Настаяцель жа гэтага манастыра ксёндз Тауш бестурботны [...] не выклікаючы належнага да сябе падпарадкавання ксяндзоў [...], а тым самым зрабіў іх безпадуладнымі яму непасрэднаму начальніку, таму яны прызвычаіліся да бяздзейнасці[...] што прывяло некаторых да п'янства ўночы ў шынках прыводзілі там да боек і сварак, за што забіраліся вайсковымі камандамі на Гаўптвахту [...].

Напрыканцы, учора ўвечары ксёндз згаданага манастыра Кучэўскі ў нецвярозым і брыдкім выглядзе пакрыўдзіў, пабіўшы, двараніна Выганоўскага, які наведаў манастыр па справе, разбіўшы яму лоб, калі ж гэты прыйшоў да мяне са скаргай, я пасылаў па Кучэўскага ў Манастыр, але той не паслухаўся [...] таму я быў вымушаны прыбыць у Кляштар, дзе знайшоў Ксяндза Кучэўскага, які быў поўнасцю п'яны і скандаліў (NGAB Grodna, 1/27/426)".

У хуткім часе пасля гэтага рапарта (3 VII 1833) гараднічы даслаў губернатару "дапаўненне", у якім адзначыў, што ўсё вышэйнапісанае ён прадставіў на разгляд мясцовага дэкана Грындвіча. Па словах гараднічага, і дэкан, у сваю чаргу, скіраваў рапарт біскупу Клангевічу. Гараднічы пісаў, што дадае да папярэдняга рапарта інфармацыю аб тым, што змешчаны на гаўптвахту ксёндз Кучэўскі ўчорашняга дня знайшоў магчымасць там жа (на гаўптвахце) напіцца "донельзя", і таму гараднічы перадаў яго ў манастыр дамініканцаў пад строгі нагляд настаяцеля, які, па словах гараднічага, "у належным падпарадкаванні мае сваіх падначаленых" і наказаў яму ўзяць пад строгі нагляд Кучэўскага.

Сітуацыя, якая склалася ў кляштары канонікаў, на думку гараднічага, яшчэ таму вымагала неадкладнага разбіральніцтва і ўмяшальніцтва, што гэты кляштар меў на ўтрыманні 10 бедных дваранскіх хлопцаў, на што была вызначана пэўная сума ў фундушы. Гэтыя хлопцы, хоць і знаходзіліся ў кляштары, "але ні ў якім разе не маюць належнага прыстойнага выхавання, бо апрануты неахайна, харчуюцца худой ежай, а навучаюцца без належнага нагляду. Урэшце, бруд як у манастыры, так і ў касцёле [...] (NGAB Grodna, 1/27/426)".

У сувязі з вышэйсказаным, гараднічы прасіў Мураўёва зрабіць распараджэнні адносна сітуацыі, якая склалася. Вядома, у гэтым выпадку можна было б казаць і пра прадузятае стаўленне гараднічага да слонімскіх канонікаў. Аднак факты, змешчаныя ў рапарце, пацвердзіліся. У выніку, праблема вырашалася на ўзроўні Віленскага біскупа, губернатараў (Гродзенскага – Міхаіла Мураўёва і Віленскага

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 07/07/2026 11:51:15



ваеннага – Мікалая Далгарукава) і ордэнскага капітула. 4 IX 1833 г. у Вільні адбываўся капітул латэранскіх канонікаў. На ім біскуп Анджэй Клангевіч звярнуў увагу на Слонімскі манастыр і прапанаваў перавесці адтуль манахаў у розныя манастыры, вызначыць ім пакаранне, а таксама зняць з пасады настаяцеля Таўша.

У Слонім жа было загадана прызначыць настаяцелем (адначасова абранага візітатарам латэранскіх канонікаў) кс. Славачынскага, які да гэтага быў настаяцелем у Магілёве. На настаўніцкія і іншыя пасады былі прызначаны каноні з іншых кляштараў, "вядомыя добрымі здольнасцямі і прыкладнымі паводзінамі". Новаму настаяцелю было загадана "мець неаслабны нагляд над паводзінамі падначаленых сваіх".

Канонікі са Слонімскага кляштара пераводзіліся ў іншыя: Кс. Ян Козьмян – у Віленскі манастыр, Ксяндзы Міхал Бруцэвіч, Адам Цоберн і Антоні Янкоўскі – у Быхаўскі, Ксяндзы Юзаф Баневіч і Геранім Кучэўскі – у Азяраны (Магілёўскай губ.). Акрамя гэтага, Казмяну, Янкоўскаму і Кучэўскаму прызначана духоўнае пакаранне (NGAB Grodna, 1/27/426).

У якасці наступнага прыкладу можна прывесці падзеі, якія адбываліся ў віленскім кляштары аўгусцінцаў ў 1842 г. Тут яшчэ ў большай ступені, чым у першым выпадку, можна заўважыць, як алкагалізм станавіўся прычынай іншых парушэнняў прынятых норм супольнага жыцця, альбо ён выступаў як адна з дрэнных звычак у комплексе з іншымі.

У лютым 1842 г. віленская рымска-каталіцкая духоўная кансісторыя дакладвала біскупу Яну Цывінскаму аб "звычаях віленскіх ксяндзоў аўгусцінцаў, а менавіта манахаў Пукшта, Ліпінскага і Даўгяла". У рапарце было адзначана, што "тры святары ордэна ксяндзоў Аўгусцінцаў эрэмітаў Барталамей Пукшта, Вінсэнты Ліпінскі і Базыль Даўгяла шматлікіх і цяжкіх дапусціліся правінаў, паколькі 1) Барталамей Пукшта, падвержаны частаму п'янству, пераапрануты ў свецкую вопратку ... выходзіў у горад без аніякага соцыя і дазволу Настаяцеляў, як ордэнскія Статуты прадпісваюць, не толькі ўдзень, але і ноччу бываў у розных месцах, а вяртаючыся позна ў кляштар, калі знаходзіў вароты і браму пазамыканымі, праз мур з дапамогай драбіны пералазіў, пасля з-за распуснага жыцця заразіўся венерычнай хваробай, што не толькі ордэнскія субраты, але і медык, які яго лячыў, у сваіх адказах Камісіі пацвердзілі; пазней быў пераведзены ў Коўна, але і там вёў сваё нястрыманае разбэшчанае жыццё: прыводзіў у кляштар распусных жанчын [...]. Не спыняючыся на гэтым, той жа кс. Пукшта, прыбыўшы з Коўна да фундушавага фальварку ксяндзоў Кармелітаў Качанішак чыніў практычна ўсю ноч разнастайную сваволю і непрыстойнасць з ахмістрыняй Францішкай Пісаравічуўнай і яе кузінай Юліяй у прысутнасці эканома Ленартовіча [...]. Пасля пераведзены ў Гальшанскі касцёл і там паводзіў сябе найгоршым чынам, менавіта: валачыўся па хатах, кампаніях, неадпаведных свайму стану і пакліканню, з вялікай ганьбай для рэлігіі і духоўнага стану, урэшце за абуральнае з нейкай жанчынай абыходжанне быў пабіты яе мужам,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 07/07/2026 11:51:15



аб чым паведаміў Ксяндзу Правінцыялу адміністратар гальшанскага касцёла кс. Радваньскі, высылаючы з Гальшан кс. Пукшта ў Вільню. Тут манах зноў, уцёкшы адзін у горад, пайшоў у кватэру Юзэфы Тамкевічуўны, якая жыла ў доме грамадзяніна Лукашэвіча пад [касцёлам] св. Ежы, як сведкі пад прысягай паказалі, займалася публічным распустай, а пачаўшы з ёй сварку і бойку, даў повад да выкліку паліцыі, якая яго разам з распусніцай адправіла ў частку, а адтуль, пад канвоем Паліцэйскага афіцэра [...] з вялікай ганьбай і згаршэннем быў адвезены ў кляштар [...] не спыняючыся на гэтым, ужо назаўтра гэты ж кс. Пукшта ў таварыстве падобнага сабе [...] кс. Даўгялы накіраваўся да квартальнага Ліпкі [...] зайшлі ў таварыстве іншых двух цывільных да трымальніцы більярда і піўной крамы маткі Гершаноўскай, што выклікала абурэнне і зневажала іх як святароў і манахаў, на бяседу і піва (LVIA, 604/1/6674, k. 1–3)".

Падобныя паводзіны меў і субрат кс. Пукшты, аўгусцінец кс. Вінсэнты Ліпінскі "бо таксама часта напіваўся, пераапрануты ў свецкую вопратку, без дазволу настаяцеляў выходзіў за брамку, дзе не раз, загуляўшы дапазна, праз кляштарны мур пералазіў, крыкам і пагрозамі кляштарны спакой парушаў, вёў распуснае жыццё, з-за чаго і заразіўся венерычнай хваробай, а пазней заўчасна жыццё скончыў (LVIA, 604/1/6674, k. 3)". Даследаванне паказвала, што "не менш вінаватым аказаўся кс. Даўгяла, які акрамя здзейсненых з першымі двумя калегамі парушэнняў, быў на вяселлі паручніка Маркіна, дзе, забыўшыся пра свой стан і пакліканне, усю ноч з жанчынамі танцаваў, і ледзь а 6 гадзіне раніцы ў кляштар вярнуўся (LVIA, 604/1/6674, k. 3–3v)".

Што прадпрымалася ў такіх выпадках? З боку ордэнскіх і епархіяльных уладаў як і ў папярэднім выпадку са слонімскімі канонікамі нічога экстраардынарнага. Як аднатавана ў дакуменце, па распараджэнні Віленскага біскупа, кс. Б. Даўгяла быў змешчаны ў кляштары віленскіх ксяндзоў місіянераў для адбыцця пакуты, а пасля яго разам з кс. Пукштам былі пераведзены для адбыцця пакуты ў віленскім кляштары бенардзінцаў. Выкананне святарскіх абавязкаў ім было забаронена. Аднак, як аднатавана ў дакуменце: "але і гэта іх не спыніла, усё адно, з новым зухвальствам ляцелі ў прорву новых правін, так далёка, што паводле ўсёй строгасці касцёльнага права выпадала б прымяніць poenam depositionis et redactionis ad communionem laicalem[1]. Але паколькі кс. Ліпінскі ўжо памёр, а кс. Даўгяла за розныя публічныя злачынствы ўжо другі раз сядзіць у публічнай турме, і за ягоныя правіны будзе яго судзіць крымінальны суд; адносна гэтых двух не чыніць ніякіх пастаноў [...] таму толькі кс. Барталамей Пукшта, які ўжо значны кавалак часу заставаўся для роздуму ў кляштары кс. Бернардзінцаў, і які ўжо выказаў нейкую надзею на выпраўленне і змены свайго ганебнага жыцця, а таму з мэтай укаранення яго ў гэтых намерах і з тым, каб даць яму магчымасць

1 Кара выдалення з духоўнага стану і звядзення ў стан свецкі.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 07/07/2026 11:51:15



выпрасіць прабачэнне так цяжка пакрыўджанага Маястату Божага, як таксама адпакутвання хаця б часткова за столькі публічных злачынстваў і паправіць хоць трохі настолькі страшныя згаршэнні, пакінуць яго яшчэ на год коштам яго ордэна ў кляштары віленскіх кс. трынітарыяў пад непасрэдным надзорам Магістра навіцыяту для адпраўлення пакуты (LVIA, 604/1/6674, k. 4–4v.)". Дакумент вызначаў, як павінен праходзіць гэты год.

Яшчэ адным прыкладам з'яўляецца справа манаха навагрудскага дамініканскага кляштара Дамініка Юдыцкага, якая разглядалася ў 1847–1848 гг. у рымска-каталіцкай духоўнай кансісторыі. Па звестках навагрудскага дэкана, "Дамінік Юдыцкі бесперапынна і ўвесь час больш аддаецца п'янству, чым прычыняе ганьбу Касцёлу і свайму сану, а народу – спакусу (LVIA, 604/5/21, k. 1)".

У выпадку наяўнасці алкагалізма ў асобнага члена супольнасці, гэта часта распаўсюджвалася і на іншых манахаў. Тут можна згадаць пра манаха бярэзінскага бернардзінскага кляштара Старэвіча. Камісія, у асобе прэлата Шантыра, скіраваная туды ў 1827 г., сярод іншага, знайшла, што "Старэвіч заўважаны тут нават у бытнасць маю ў схільнасці да залішняга ўжывання алкагольных напояў і схілення да гэтага ж субратаў сваіх (RGIA, 821/125/140, k. 4)".

Празмернае спажыванне алкаголю станавілася таксама прычынай суіцыдаў. Так, у гродзенскім кляштары францысканцаў ў жніўні 1846 г. здзейсніў самагубства манах Барталамей Барцэвіч. Першапачаткова, аднак, некаторыя субраты бр. Барцэвіча спрабавалі прадставіць сітуацыю як вынік прыцяснення з боку настаяцеля. У выніку следства аказалася (4 II 1847 г.), што за некалькі дзён да смерці ў кс. Барцэвіча паднялася высокая тэмпература, а паколькі меў праблемы з алкаголем, то злоўжываў ім і падчас хваробы, нягледзячы на забароны лекараў. Праз гэта яго хвароба ўзмацнілася да такой степені, што "што быўшы ў трызненні 17 чысла Жніўня 1846 года знойдзены ў сваім пакоі на падлозе з перарэзаным брытваю горлам, і хоць пры падачы медыцынскай дапамогі, Барцэвіч жыў некалькі дзён і нават прамаўляў даволі гучна словы, але аб прычынах самагубства нічога не растлумачыў (NGAB Grodna, 1/21/290)". Спробы некаторых іншых францысканцаў абвінаваціць настаяцеля ў смерці кс. Барцэвіча ў выніку патлумачыліся тым, што тыя святары (кс. Ільгевіч і Альшэўскі), якія яго абвінавачвалі, таксама злоўжывалі алкаголем. Настаяцель іх неаднаразова адпраўляў на пакуту, аднак выпраўлення не здаралася, а напружанне ва ўзаемаадносінах захоўвалася. У выніку, гэтыя святары ў чарговы раз былі адпраўлены на пакуту ў іншыя кляштары (NGAB Grodna, 1/21/290).

У 1847 г. на тэрыторыі Украіны, у Луцку, у выніку алкагалізму здзейсніў спробу суіцыду дамініканец а. Станкевіч. У дакуменце, які апісваў гэты выпадак, адзначалася: "гэта ўжо не першы прыклад настолькі супярэчнага хрысціянскім правілам злачынства сярод рымска-каталіцкага манаства (NGAB, 1781/2/2891)". Вынікам гэтага суіцыду стала прадпісанне рымска-каталіцкай духоўнай калегіі ўсім дэканам аб'явіць пра абавязак стрыманасці асоб схільных да спажывання

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 07/07/2026 11:51:15



алкагольных напояў аб выкананні чаго і рапартавалі дэканы на працягу 1848 г. (NGAB, 1781/2/2891).

Пералічаныя фактары не былі характэрны выключна для рымска-каталіцкіх манаскіх супольнасцей. Падобныя з'явыназіраліся і ў базыльянаў. Пашыранасць празмернага спажывання алкаголю прывяла да таго, што з падобнай з'явай разбіраўся прадстаўнік протаархімандрыта. Ён вырашаў, як мае паступаць манах, калі ён з'яўляецца перад сваімі братамі п'яным, што, праўдападобна, здаралася нярэдка. У сувязі з гэтым, у кляштары базыльянаў у Быцені ў 1787 г. быў складзены адмысловы дакумент. Ён прадпісваў, якімі словамі манах мусіць выбачацца перад начальствам і братамі, у іх прысутнасці, кланяючыся па тры разы. Здзейсніўшы такую правіну манах у рэфектарыі падчас абеду перад пачаткам лекцыі, укленчыўшы пасярэдзіне гучна, каб усе зразумелі, тры разы павінен быў сказаць: "Шаноўныя ўсёй павагі годныя айцы і наймілейшыя браты! Прабачце мне, што я вас згоршыў п'янствам маім і нястрыманасцю! І Пана Бога прасіце, каб мне дараваў" (ÖN, 2798, p. 379)[2].

**4. Рэкрэацыйная / святочная функцыя**. Гэтая роля таксама цесна звязана з традыцыйнай. Да сярэдзіны XIX ст. абстыненцкія ідэі і тэндэнцыі не былі шырока пашыраны сярод манаскіх супольнасцей на беларуска-літоўскіх землях. Святочныя дні традыцыйна прадугледжвалі спажыванне альбо большай колькасці традыцыйнага алкаголю, альбо выкарыстанне больш моцных напояў, альбо лепшых па якасці. Напрыклад, віленскія бернардзінцы на святкаванне ўспаміну св. Антонія 13 VI 1810 г. набылі 4 бутэлькі старога віна, на што выдалі 40 зл., 8 гарнцаў мёду за 16 зл. і 3 гарнцы лёгкага піва, якое каштавала 1 зл. 10 гр. (LVIA, 694/1/144).

**5. Статусная функцыя**. Гэтая функцыя алкагольных напояў цесна звязана з папярэдняй, рэкрэацыйнай. Добрыя віды алкаголю, якія набываліся, часта захоўваліся ў келлі настаяцеля. Яны выкарыстоўваліся, напрыклад, пры прыёме важных для кляштара альбо настаяцеля гасцей.

Тут у якасці прыкладу прывядзем звесткі з кнігі прыходу і расходу грошай бялыніцкага кармеліцкага кляштара за 1832 г. У ёй, акрамя іншага, маюцца наступныя запісы:

За вядро віна для касцёла – 18 р. ас[ігнацыямі].

За 6 бутэлек портэру **для гасцей** – 18 р. ас. (выдзелена – РЗ.)

За 16 бутэлек французскага віна – 27 р. ас. 20 к.

За 6 бутэлек добрага рому – 22 р. ас. 50 к. (NGAB, 1297/1/6488, k. 21)

Віленскія манахіні бернардзінкі ў жніўні 1840 г. выдалі за 5 бутэлек рому і 2 гарнцаў белага віна для гасцей – 7 р. 60 к., а ў кастрычніку таго ж года за 5 бутэлек портэру для гасцей заплацілі 3 р. (LMAVB, 318/59).

---

[2] Выказваю шчырую падзяку за прадстаўлены матэрыял з Österreichische Nationalbibliothek к.г.н. Дзянісу Васільевічу Лісейчыкаву

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 07/07/2026 11:51:15



**6. Харчовая роля**. Важнай роляй была ўласна харчовая (таксама цесна звязана з традыцыйнай). Спрадвеку прагу наталялі півам, якое таксама было і складовай часткай страў, напрыклад, піўных супоў. Піва складала абавязковы элемент штодзённага харчавання членаў манаскіх супольнасцей, а колькасць яго спажывання традыцыйна павялічвалася ў пасты. Гарэлка ў невялікіх дозах садзейнічала страваванню, а таксама часам выкарыстоўвалася як лекавы сродак. Захаваліся нататкі аб тым, які і якім чынам спажываўся алкаголь у кляштары трынітарыяў у Вільні на Антокалі. “Гарэлка даецца па келішку перад абедам і вячэрай. Манахам, якія не п’юць гарэлкі раніцай гарбата, а часта перад абедам бакал віна. У святы і на пахавальныя вячэры дубальтовае піва, а часам пунш з добрым ромам (VUB, 57/54/150, k. 207v.)”.

**7. Гаспадарча-эканамічная роля**. Алкагольныя напоі для манаскай супольнасці былі як пунктам выдаткаў, так і крыніцай прыбыткаў.

*Выдаткі на алкаголь*. У выпадку, калі пры кляштары не было бровара, альбо прадукцыя наяўнага была недастатковай (альбо мела вузкі асартымент) алкаголь набывалі. Так, маладзечанскія трынітарыі выдавалі на алкаголь для манахаў 250 р. у год – набывалі гарэлку, піва, віно, арак (LVIA, 694/1/3819, k. 40v.). Калі ў кляштарным бровары варылі толькі піва, у такім выпадку набывалі іншыя віды алкаголю. Так, навагрудскія езуіты ў 1773 г. набывалі штомесяц 40 гарнцаў простай гарэлкі і выдавалі на гэта 40 злотых. У год на віно і прыправы яны выдавалі 800 злотых (Mariani, 2020, s. 26).

Віленскія францысканцы ў 1810 г. выдалі на алкаголь наступныя сумы: у траўні, 8 V – за бочку “добрага” піва – 25 зл.; 22 V – за бутэльку “лепшага” віна – 6.20 зл.; 30 V – за бутэльку “лепшага” віна – 6.20 зл.; у чэрвені: 1 VI – за гарнец салодкай гарэлкі – 9 зл.; 11 VI – за ¾ гарнцы віна – 55,8 зл.; 13 VI – за 4 бутэлькі старога віна – 40 зл.; за 8 гарнцаў мёду (пітнога) – 16 зл.; за 3 гарнцы лёгкага піва – 1 зл. 9 гр. У ліпені значна павялічыліся выдаткі на піва: 1 VII – за 9 гарнцаў піва – 18 зл., 2 VII – за 2 бутэлькі старога віна – 20 зл., 2 VII – за 2 гарнцы піва – 6 зл., 3 VII – за 4 гарнцы піва – 5 зл. 10 гр., 4 VII – за 5 гарнцаў піва – 7 зл., 5 VII – за 4 гарнцы піва – 5 зл. 10 гр. Пасля, штодзённа, да 20 VII набывалі па 3–4 гарнцы піва. У наступным месяцы колькасці алкаголю, які набывалі, значна зменшыліся (LVIA, 694/1/144).

Аршанскія трынітарыі, супольнасць якіх ў 1826 г. складалася з 10 чалавек (5 святароў, 3 клерыкі і 2 браты), выдавалі на алкаголь (у яго пераліку называлі віно, мёд, гарэлку і піва) для спажывання ў кляштары 400 р. у год (NGAB, 1781/26/1441, k. 21v.). Гэта было больш чым на віно, воск і касцёльныя патрэбы (на іх прызначалася 337 р.), у 5 разоў больш чым на “аптэку” (на яе прызначаўся 81 р.), больш чым на патрэбы правінцыі і Галоўнай семінарыі (абавязковы падатак, ускладзены ўладамі на кляштары), на іх выдаваўся 390 р., у 13 разоў больш чым на бібліятэку (на яе прызначылі 32 р.), і ў 10 разоў больш чым “падаткі ў манаршую казну”, якія былі роўныя 41 р. (NGAB, 1781/26/1441).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 07/07/2026 11:51:15



Невялікая супольнасць бабінавіцкіх трынітарыяў у тым жа 1826 г. выдала агулам "на напоі" (г.зн. каву, лікёр, віно, арак) 101 р., што было амаль у 2 разы больш чым на рамонт кляштару (56 р.), у 10 разоў больш чым "на лякарства" (11 р.), але ў 2 разы менш чым на вопратку манахаў і кляштарных слугаў, на што было прызначана 210 р., а таксама ў 2,5 разы менш, чым на ежу (мяса, рыба, соль і г.д.) (NGAB, 1781/26/1441).

Віцебскія трынітарыі, супольнасць якіх у 1827 г. складалася з 4 асоб, выдалі ў год на алкаголь (мёд, піва і віно), каву і цукар 100 р. Тут варта адзначыць, што гэты кляштар меў уласны бровар, што змяншала выдаткі (NGAB, 1781/26/1441). Калі казаць пра прапорцыі, то гэта было больш чым на ацяпленне і свечкі, на што было прызначана 60 р., больш чым на вопратку для манахаў (72 р.), амаль у 2 разы больш чым на Галоўную семінарыю (56 р.), 11 разоў больш, чым на аптэку (9 р.), 11 разоў больш, чым на бібліятэку (9 р.) і ў 10 разоў больш, чым на рамонт касцёла. Большыя сумы выдалі толькі на ежу (мяса, рыбу, соль, алей, аліву, муку, масла і г.д. – 260 р.), коней, павозкі, сена, авёс і пошту – 238 р., на рамонт кляштару і гаспадарчых пабудоў – 360 р. (NGAB, 1781/26/1441).

Калі алкаголь выраблялі ва ўласных броварах, то некаторыя выдаткі былі звязаныя менавіта з працэсм вытворчасці. Набываўся той алкаголь, які не выраблялі самі, альбо ў выпадку недахопу ўласнага. Так, у 1840 г., паводле кнігі прыходу і расходу сум віленскага кляштара сясцёр бенедзікцінак, у студзені імі было выдадзена на вытворчасць Кескага бровара 60 р., у лютым – за 6 гарнцаў спірту 12 р., у сакавіку: 1) людзям, занятым пры вытворчасці мёду ўзнагароджання дадзена – 4 р., у жніўні – за 5 бутэлек рому і 2 гарнцы белага віна для гасцей – 7 р. 60 к., за 2 гарнцы спірту – 4 р., у верасні за 82 гарнцы гарэлкі – 13 р. 20 к., за 4 бутэлькі рому і 3 портэру – 5 р. 70 к., у кастрычніку за бочку нямецкага піва – 3 р. 72 к., за 5 бутэлек портэру для гасцей – 3 р. а таксама за тытунь на табаку для манахінь – 2 р. (LMAVB, 318/59).

Кніга расходаў шпіталю сясцёр міласэрнасці ў Вільні пры вуліцы Савіч адзначае наступныя пазіцыі выдаткаў: у лістападзе 1824 г. 80 р. за 60 гарнцаў гарэлкі, а ў сакавіку 1825 г. за гарнец віна 8 р. (LMAVB, 318/61). Слонімскія бернардзінкі паводле кнігі прыходу і расходу за 1840 г. выдалі ў студзені за 5 фунтаў кавы 1 р. 88 к., за 65 гарнцаў гарэлкі – 9 р. 75 к.; у лютым на 1 бутэльку араку – 75 к., за 6 гарнцаў віна ў касцёл 8 р., за 65 гарнцаў гарэлкі – 8 р. 85 к., за піва на кухню – 38 к.; у сакавіку за бочку піва (32 гарнцы) на кухню 1 р. 20 к., за бочку піва (35 гарнцаў) – 1 р. 42 к.; у красавіку за 1 гарнец 2 кварты віна – 90 к. Яны ж выдалі для 19 манахінь на піва кожнай па 75 кап. срэбрам, на квартал – 14 р. 25 к., за 1 бутэльку араку – 75 к., у чэрвені за 2 бутэлькі араку 1 р. 50 к., за 107 гарнцаў гарэлкі – 16 р. 8 к. (LMAVB, 318/66).

Гродзенскія бернардзінкі ў 1840 г. больш прадалі алкаголю, чым купілі. Сярод выдаткаў на алкаголь знаходзіцца згадка толькі пра набыццё 2 бутэлек віна ў сакавіку, на што выдалі 2 р. 25 к. (LMAVB, 318/67). Гродзенскія брыгідкі

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 07/07/2026 11:51:15



у 1861 г. набывалі наступныя віды алкаголю: у сакавіку купілі 10 гарнцаў пітнога мёду па 50 к. за 1 гарнец (5 р.), у чэрвені 2 бочкі піва па 2.50 р. (5 р.), у верасні – бочку піва 2.50 р., у кастрычніку – віно ў касцёл палова анкара (9 р.) (LMAVB, 318/1207). Віленскія францысканцы ў 1862 г. кожны квартал (у студзені, траўні, кастрычніку) набывалі па анкару чырвонага віна. Кожны раз за гэта плацілі па 18 р. 50 к. (LMAVB, 318/1206).

Згаданыя традыцыі ўжывання алкаголю былі характэрны не толькі для рымска-каталіцкіх манастыроў. Базыльянскія кляштары мелі падобныя традыцыі. Напрыклад, у склепах беразвецкага кляштара ў 1829 г. захоўвалася 160 вядзёр гарэлкі, 120 вядзёр пітнога мёду, 20 гарнцаў французскага віна (NGAB, 1668/1/1, k. 13). Барысаўскі кляштар базыльянаў у 1817 г. выдаў на віно 267 р. 75 к. асігнацыямі, а на гарэлку – 256 р. 65 к. ас.[ігнацыямі] (для параўнання на патрэбы царквы за той жа год было выдадзена 56 р.30 к. ас[ігнацыямі], а на мяса – 102 р. 70 к.ас[ігнацыямі]). За той жа 1817 г. полацкі кляштар выдаў на ром і мёд 86 р. 25 к. ас[ігнацыямі], на віно – 214 р. асігнацыямі (у тым жа годзе на пабудову млына-ветрака імі ж выдадзена 154 р. ас[ігнацыямі]) (NGAB, 3421/1/158).

Пэўныя змены ў колькасці і відах алкаголю, які набываўся і вырабляўся адбыліся пасля 1842 г., калі кляштарныя маёнткі былі забраны ў казну, а манаскім супольнасцям было вызначана штатнае ўтрыманне ў залежнасці ад класа. З цягам часу пачыналаназірацца тэндэнцыя да набыцця больш моцных напояў.

*Даход ад алкаголю* ажыццяўляўся праз здачу ў арэнду корчмаў і пастаўкі туды алкаголю (Szylar, 2013, s. 454–455; Łoś, 2013, s. 614). Так, гродзенскія бернардзінкі у 1840 г. у студзені атрымалі даходу ад продажу гарэлкі “за 20 гарнцаў гарэлкі ад селяніна Каленіка – 3 р., за 33 гарнцы гарэкі – 4 р. 49 к., у сакавіку прапінацыі з карчмы – 60 р.” (LMAVB, 318/67). Ковенскія бенедзікцінкі ў студзені 1841 г. атрымалі 25 р. даходу з квесоўскай карчмы, а ў лютым таго ж года – 19 р. 15 к. (LMAVB, 318/1215). Княжыцкія даміліканцы мелі 3 карчмы, якія здавалі ў арэнду і мелі даходу з іх разам – 870 р. у год (NGAB, 1781/26/1386, k. 24v). Пэўным выключэннем былі ўшацкія даміліканцы, якія ў візіце 1818 г. падалі звесткі аб тым, што “карчмы няма аніводнай” (NGAB, 1781/26/1396).

Місіянеры св. Вінсэнта дэ Поль, якія працавалі ў Магілёўскай духоўнай семінарыі і ўласна Магілёўская семінарыя мелі ва ўласнасці фальварак Плоскае, які ў 1804 г. прынёс даходу за продаж гарэлкі ў корчмах наступныя сумы: за гарэлку ў шынку – 302 р. 72 ½ к., за піва ў шынку – 73 р. 79 к. (NGAB, 1781/2/72). Дадаткова, ад арэнды 3 корчмаў у тым фальварку місіянеры атымлівалі штогод сумарна 300 р. (NGAB, 1781/2/72).

**8. Абцяжарваючая функцыя**. У XIX ст. расійскі ўрад, часта прымусова надаваў каталіцкім кляштарам шэраг неўласцівых ім функцый. Адной з іх была пенітэнцыярная, альбо яе падабенства (падрабязней гл.: Zianiuk, 2021),

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 07/07/2026 11:51:15



і ператварэнне нескасаваных манастыроў у падабенства пенітэнцыярных устаноў. Асноўнай катэгорыяй правінаў духавенства, якія ссылаліся ў кляштары, былі палітычныя: разнастайныя формы ўдзелу ў паўстаннях (1830–1831 гг. і 1863–1864 гг.), прамаўленне пропаведзяў, якія залічваліся да палітычных/супраць дзеючай улады. Менш распаўсюджанай, але таксама дастаткова рэгулярнай прычынай быў алкагалізм. У сувязі з гэтым, у кляштары ссылаліся як манахі, так і дыяцэзіяльныя святары, якія мелі праблемы з алкаголем. Вядома, гэта не магло не ўплываць на жыццё супольнасці, якая вымушана была суіснаваць з духоўнымі асобамі, са шкоднымі звычкамі. Сітуацыю ўскладняла тое, што гэта былі "чужыя" прастаўнікі духавенства, якя не належалі ані да канкрэтнай манаскай супольнасці, ані да ордэна, якому належаў кляштар. Змяшчаліся яны ў кляштар "под надзор местного настоятеля". Утрымання на гэты час духавенства не атрымлівала, і павінна было забяспечыць сябе з уласных сродкаў. Да 1842 г. у якасці такіх кляштараў выбіраліся тыя, што мелі дастатковы фонд. Пасля 1832 г., у сувязі з першай хваляй касацыі, колькасць кляштараў, якія маглі быць абраны ў якасці месцаў для адбыцця пакарання зменшылася напалову. У выніку, часцей за ўсё месцамі ссылак (да часу іх касацыі) станавіліся магілеўскі бернардзінскі, забельскі дамініканскі, гродзенскі францысканскі і некаторыя віленскія кляштары. Да канца XX ст. такую функцыю працягвалі захоўваць нешматлікія дзейныя кляштары, напрыклад, гродзенскі францысканскі і аглонскі дамініканскі.

Так, напрыклад, у віленскі францысканскі кляштар у 1837 г. за п'янства быў сасланы вікарый лівенгофскага касцёла (дэканат Ніжні Дынабург) кс. Ян Альшэўскі (NGAB, 1781/2/2044), у 1839 г. у забельскі дамініканскі кляштар за п'янства быў сасланы кс. Шыманьскі (NGAB, 1781/2/1542), а ў 1841 г. туды ж за алкагалізм быў сасланы адміністратар Мікулінскай парафіі кс. Клеменс Мікуцкі (NGAB, 1781/2/2292).

Спачатку ў трокскі, а адтуль – у астравецкі дамініканскі кляштар за п'янства быў сасланы кс. Карл Ігнатовіч (LVIA, 604/1/9839). У 1850 г. «На пакаянні» там ён знаходзіўся 7 год. Дрэнную звычку не мог перамагчы, у сувязі з чым, пастановай Віленскага біскупа ад 5 XII 1847 г. яму было забаронена выкананне святарскіх функцый.

У 1853 г. у магілёўскі бернардзінскі кляштар за п'янства быў скіраваны вікарый фашчаўскага касцёла кс. Станіслаў Місевіч (NGAB, 1781/2/3912). Прадпісвалася "заключить его в монастырь на время, смотря по обстоятельствам и стечении его вины или впредь до исправления (NGAB, 1781/2/3912)". Чамусьці ўлады лічылі, што ў кляштары над такімі святарамі будзе забяспечаны пастаянны нагляд.

У канцы 60-ых гг. XIX ст. у спісе манаскага і дыяцэзіяльнага духавенства, адпраўленага ў гродзенскі кляштар францысканцаў па распараджэнні начальства былі і тыя, каго змяшчалі там у сувязі з алкагалізмам. Сярод іх былі піяры

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 07/07/2026 11:51:15



кс. Станіслаў Якукевіч, пераведзены па прапанове кіраўніцтва дыяцэзіі ад 22 VII 1865 г. за № 1206 за п’янства і кс. Фама Семяновіч, прапановай ад 8 VIII 1868 г. за № 950 “у сувязі з хваробай да выздараўлення і адкрыцця вакансій”. Тады ж адзначалася, што “манастыр на іх утрымання не атрымлівае” (NGAB Grodna, 1/6/1661).

Каталіцкія манастыры не маглі прыстасавацца да выканання пенітэнцыярнай функцыі, паколькі 1) не мелі ўстойлівай традыцыі фізічна прымусова абмяжоўваць людзей, 2) не мелі для гэтага рэсурсаў, у тым ліку фінансавых, асабліва пасля 1842 г. У выніку, вымушаная рэалізацыя розных накірункаў пенітэнцыярнай функцыі станавілася абсалютна фармальнай. Святары, у тым ліку з праблемамі з алкаголем, якіх накіроўвалі ў манастыры, фактычна не мелі ніякіх абмежаванняў, акрамя ўласна святарскіх: забароны прамаўляць пропаведзі і слухаць споведзі. Яны мелі магчымасць штодзённага выхаду з манастыроў, у выніку чаго “выпраўлення”, якое было мэтай такога знаходжання не адбывалася. Напрыклад, згаданы кс. Клеменс Мікуцкі, накіраваны ў забельскі дамініканскі кляштар у 1841 г. на пакаянне за п’янства, як адзначаў настаяцель манастыра, штодзённа выходзіў у карчму, і з цягам часу дайшоў нават да таго, што заставаўся там начаваць. Адсутнасць кантролю дазваляла кс. Мікуцкаму двойчы збягаць з забельскага манастыра (NGAB, 1781/2/2292).

Згаданая складанасць у выкананні пенітэнцыярнай функцыі выклікала перанясенне яе з манастыра на манастыр. Так, згаданы кс. Клеменс Мікуцкі, адбыўшы “на пакаянні” у забельскім дамініканскім манастыры 3 гады (1841–1844), быў пераведзены ў магілёўскі бернардзінскі манастыр (у 1844 г.). Аднак і з таго манастыра праз непрацяглы час пачалі паступаць скаргі на немагчымасць утрымання кс. Мікуцкага ў сувязі з праявай псіхічнай няўраўнаважанасці і суіцыдальнымі схільнасцямі. Улады кляштара рэгулярна прасілі перавесці яго ў “богаўгодную ўстанову”, што і было зроблена. Вярнуўшыся праз год у манастыр як “вылечаны” у хуткім часе ён ізноў пачаў паводзіць сябе непрыстойна: ужываў алкаголь, пакідаў манастыр без дазволу і ў п’яным выглядзе разгульваў па горадзе (NGAB, 1781/2/2292, k. 31, 34v–35, 60–62).

Падсумоўваючы, адзначым, што ў XIX ст. у каталіцкіх манаскіх супольнасцях на тэрыторыі беларускіх і літоўскіх землях ужываліся традыцыйныя для рэгіёна алкагольныя напоі: піва, мёд, віно, гарэлка. Алкагольныя напоі былі важным элементам як харчовага складніка ў каталіцкіх манаскіх супольнасцях, так выконвалі і шэраг іншых роляў. У жыцці манаскіх супольнасцей алкаголь адыгрываў традыцыйную, кансалідуючую, дэзінтэгруючую, рэкрэкцыйную, гаспадарча-эканамічную, статусную і абцяжарваючую ролі.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 07/07/2026 11:51:15



# REFERENCES / BIBLIOGRAFIA


**Archival sources / Źródła archiwalne**

BCZ – Biblioteka Czartoryskich w Krakowie

sygn. K2561. Directorium horarum canonicarum et missarum In Annum MDCCXCI pro Carmelitis Discalceacis Provinciae Litvaniae.

CNB – Cèntral′naâ navukovaâ bìblìâtèka ìmâ Âkuba Kolasa Nacyânal′naj akadèmìì navuk Belarusì [Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі]

F. 23, op. 1, spr. 219.

LMAVB – Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka

F. 318, d. 59, 61, 66, 67, 1206, 1207, 1215.

LVIA – Lietuvos valstybes istorijos archyvas

F. 604, ap. 1, d. 6674, 9839.

F. 604, ap. 5, d. 21.

F. 694, ap. 1, d. 144, 3819.

NGAB – Nacyânal′ny gìstaryčny arhìŭ Belarusì [Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі]

F. 1297, op. 1, spr. 6488.

F. 1668, op. 1, spr. 1.

F. 1781, op. 2, spr. 72, 1542, 2044, 2292, 2891, 3912.

F. 1781, op. 26, spr. 1386, 1396, 1441.

F. 1781, op. 27, spr. 370, 430.

F. 3421, op. 1, spr. 158.

NGAB Grodna – Nacyânal′ny gìstaryčny arhìŭ Belarusì ŭ Grodna [Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродна]

F. 1, op. 6, spr. 1661.

F. 1, op. 21, spr. 290.

F. 1, op. 27, spr. 426.

ÖN – Österreichische Nationalbibliothek

Nr 2798.

RGIA – Rossijskij gosudarstvennyj istoričeskij arhiv [Российский государственный исторический архив]

F. 574, op. 2, d. 808.

F. 821, op. 152, d. 140.

VUB – Vilniaus universiteto biblioteka

F57, ap. 54, d. 150.

**Printed sources / Źródła drukowane**

Inwentarze. (2020). *Inwentarze Kolegium jezuitów w Nowogródku oraz jego majątków ziemskich z przełomu roku 1773 i 1774*. A. Mariani (opr. i wstęp). Poznań: Wydawnictwa Naukowe Uniwersytetu im. Adama Mickiewicza.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 07/07/2026 11:51:15



**Studies / Opracowania**

Dias-Lewandowska, Dorota. (2017). Czy alkohol jest używką? Wstęp do badań nad kulturą picia w Polsce w czasach nowożytnych. *Przegląd Historyczny*, 108(2), s. 263–277.

Dias-Lewandowska, Dorota. (2019). „Pijak [...] kubek w kubek, jak świnia”. Przemiany krytycznego dyskursu wobec pijaństwa i alkoholu na ziemiach polskich. *Przegląd Historyczny*, 110(4), s. 657–669.

Łoś, Walentyna. (2013). Sytuacja gospodarcza klasztorów bazylianek na Wołyniu u progu kasat (koniec XVIII – początek XIX w.). W: M. Derwich (red.), *Klasztor w gospodarce średniowiecznej i nowożytnej* (s. 611–622). Wrocław: Pracownia Badań nad Dziejami Zakonów i Kongregacji Kościelnych LARHCOR.

Sporek, Jerzy. (2013). Uprawa winorośli i produkcja wina jako istotny element gospodarki opactwa benedyktynów w Gengebach w Badenii. W: M. Derwich (red.), *Klasztor w gospodarce średniowiecznej i nowożytnej* (s. 489–514). Wrocław: Pracownia Badań nad Dziejami Zakonów i Kongregacji Kościelnych LARHCOR.

Szylar, Anna. (2013). „Sprawa o tym, jak benedyktynki gospodarstwo prowadziły”. Organizacja i funkcjonowanie gospodarki opactwa benedyktynek w Sandomierzu w XVII i XVIII w. W: M. Derwich (red.), *Klasztor w gospodarce średniowiecznej i nowożytnej* (s. 447–459). Wrocław: Pracownia Badań nad Dziejami Zakonów i Kongregacji Kościelnych LARHCOR.

Unger, Ričard. (2023). *Pivo v srednevekov'e*. Moskva: AST. [Унгер, Ричард. (2023). *Пиво в средневековье*. Москва: АСТ].

Zianiuk, Raisa. (2021). The Evolution of the Role of Roman Catholic Monasteries in Belarus from the Nineteneeth Century to the Beginning of the Twentieth Century. *Roczniki Teologii Katolickiej*, 20, s. 103–122.

Zaniuk, Raìsa. (2022). Tradycyì spažyvannâ ì vyrabu alkagolû ŭ rymska-katalìckìh manastyrah ì semìnaryâh na belaruska-lìtoŭskìh zemlâh (1772–1914). *Belaruskì gìstaryčny aglâd*, 29(1–2), s. 57–74. [Зянюк, Раіса. (2022). Традыцыі спажывання і вырабу алкаголю ў рымска-каталіцкіх манастырах і семінарыях на беларуска-літоўскіх землях (1772–1914). *Беларускі гістарычны агляд*, 29(1–2), с. 57–74].

SUBMITTED: 2025.06.26
ACCEPTED: 2025.10.25
PUBLISHED ONLINE: 2026.01.30

## ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

**Raisa Zaniuk / Раіса Зянюк** – Białoruś; badaczka niezależna; dr; *specjalność*: historia Białorusi; *zainteresowania naukowe*: dzieje Kościoła rzymskokatolickiego na ziemiach białoruskich.

*W kontakcie pośredniczy redakcja – adres*: Plac Marii Curie-Skłodowskiej 4A, 20-031 Lublin, Polska

*Wybrane publikacje:*

1. Зянюк Р. (2017). *Навучальныя ўстановы рымска-каталіцкай царквы ў Беларусі (1772–1914 гг.)*. Мінск: Беларуская навука.
2. Зянюк Р. (2023). *Ксёндз Юзаф Барадзюля: жыццяпіс і ўспаміны*. Мінск: Pro Christo.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 07/07/2026 11:51:15



3. Zianiuk R. (2021). The Evolution of the Role of Roman Catholic Monasteries in Belarus from the Nineteneeth Century to the Beginning of the Twentieth Century. *Roczniki Teologii Katolickiej*, 20, s. 103–122.
4. Зянюк Р. (2022). Традыцыі спажывання і вырабу алкаголю ў рымска-каталіцкіх манастырах і семінарыях на беларуска-літоўскіх землях (1772–1914). *Беларускі гістарычны агляд*, 29 (1–2), s. 57–74.
5. Зянюк Р. (2020). Канверсія рымска-каталіцкага манаскага духавенства ў праваслаўе як выкарыстанне магчымасці сацыяльнага ліфту ў першай трэці XIX ст. *Беларускі гістарычны часопіс*, 11, s. 5–12.